ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
17
ЛЮТАГА
ЧАЦВЕР
№ 6 (1382)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
## тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### ЗАХАПЛЯЮЧАЕ ПАДАРОЖЖА

**ў Баку ажыццявіла на зімовых канікулах група замежных студэнтаў з Кубы, Лаоса, ГДР, Алжыра, Афганістана і Іарданії, што вучацца ва універсітэце. У час паездкі яны пазнаёміліся са сталіцай Азербайджана і яе ваколіцамі, памятнымі месцамі Апшэронскага паўвострава. Замежныя студэнты наведалі таксама Батанічны сад, Дом-музей Сяргея Ясеніна, ВДНГ рэспублікі, музей выяўленчага мастацтва. Былі арганізаваны паходы ў драматычны тэатр, філармонію, тэатр музкамедыі.**

**У. ПУЗІКАЎ,**
**намеснік дэкана па рабоце з замежнымі навучэнцамі.**

### ТРАДЫЦЫЙНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ

**па валейболу на кубак універсітэтаў Прыбалтыкі і Беларусі прайшлі нядаўна ў Рызе. Нягледзячы на вострую канкурэнцыю, жаночая каманда нашага універсітэта заняла другое месца, а валейбалісты-мужчыны заваявалі ганаровае трэцяе.**

**А. БАЛДЗІН,**
**старшыня спартыўнага клуба.**

### СПАРТЫЎНАЕ МАЙСТЭРСТВА

**па кулявой стральбе, валейболу і баскетболу прадэманстравалі супрацоўнікі універсітэта. Па стральбе паспяхова выступіла каманда НДІ ПФП (адказны А. Смірноў), па валейболу — кафедры фізвыхавання (В. Харук), па баскетболу — ФПМ (Л. Вараб'ёў). Спаборніцтвы праходзілі па праграме спартакіяды «Здароўе».**

**М. КУЧЫНСКІ,**
**старшыня спартыўна-масавай камісіі прафкома універсітэта.**

### З КАНЦЭРТНАЙ ПРАГРАМАЙ

**перад працаўнікамі калгаса імя Кастрычніцкай рэвалюцыі Міёрскага раёна выступіў хор народнай песні выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Цёпла сустракалі харыстаў таксама жыхары вёскі Пераброддзе, радзімы беларускага кампазітара Шыманскага.**

**Харавая капэла універсітэта ўзнагароджана Ганаровымі граматамі праўлення калгаса і Міёрскага райкома партыі.**

**С. ВАЛЯНЦІНАВА,**
**удзельніца хору.**

# З ПАЗІЦЫІ ВЫСОКАЙ АДКАЗНАСЦІ

## СА СХОДУ ПАРТЫЙНАГА АКТЫВУ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

АДБЫЎСЯ сход партыйнага актыву Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, які абмеркаваў вынікі лістападаўскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС і задачы партыйнай арганізацыі універсітэта ў святле яго рашэнняў. На сходзе партыйнага актыву прысутнічалі члены партыйнага камітэта універсітэта, партыйных бюро факультэтаў і падраздзяленняў, партгрупоргі, члены парткамісіі і камісіі кантролю дзейнасці адміністрацыі, члены рэктарата, дэканы і іх намеснікі, загадчыкі кафедраў, кіраўнікі падраздзяленняў і служб, члены КПСС, якія выбраны ў састаў кіруючых прафсаюзных і камсамольскіх органаў універсітэта. У рабоце сходу партыйнага актыву прынялі ўдзел загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ Ю. П. Смірноў, міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкоў, першы сакратар Маскоўскага РК КПБ г. Мінска Б. А. Саўчанка, інструктар ЦК КПБ Л. М. Давыдзенка, намеснік загадчыка аддзела навукі і навучальных устаноў Мінскага АК КПБ С. Ф. Сіманькова.

З дакладам выступіў сакратар парткома універсітэта М. Г. Елісееў. У спрэчках выступілі сакратар партбюро ўпраўлення, дырэктар бібліятэкі І. У. Арэхоўская, сакратар партбюро ФПМ М. М. Федзяня, дэкан факультэта радыёфізікі і электронікі А. М. Шырокаў, дырэктар НДІ ПФП А. Ф. Чарняўскі, старшыня праўлення таварыства «Веды» універсітэта В. І. Гамаў, дэкан фізічнага факультэта Э. М. Шпілеўскі, дэкан факультэта па навучанню замежных грамадзян Л. М. Аўсянка, намеснік прарэктара па навуцы М. І. Казлоўскі.



Удзельнікі сходу партыйнага актыву.



Уручэнне Ганаровай граматы Вярхоўнага Савета БССР газеце «Беларускі універсітэт».

У дакладзе і выступленнях адзначалася, што камуністы, калектыў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, як і ўвесь савецкі народ, цалкам і поўнасцю адабраюць рашэнні лістападаўскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС, дакументы, прынятыя сёмай сесіяй Вярхоўнага Савета СССР, палажэнні і вывады, якія змешчаны ў дакладзе таварыша Ю. У. Андропава на ўрачыстым пасяджэнні ў Крамлі 21 снежня 1982 г., выражаюць рашучасць настойліва змагацца за паспяховае выкананне планаў партыі, заданняў XI пяцігодкі.

Пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый ва універсітэце было разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва ў гонар 60-годдзя ўтварэння СССР, якое садзейнічала паспяховаму выкананню заданняў юбілейнага года па падрыхтоўцы і выпуску маладых спецыялістаў, набору студэнтаў на першы курс усіх форм навучання, развіццю навуковых даследаванняў.

Калектыў СКТБ з доследнай вытворчасцю і выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна выйшлі пераможцамі Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва ў сістэме МінВНУ СССР.

Значны ўклад калектыў універсітэта ўнёс і ў рэалізацыю рашэнняў майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС, Харчовай праграмы СССР. Па 13 тэмах вядуцца распрацоўкі навуковых праблем, непасрэдна звязаных з Харчовай праграмай.

Інтэнсіфіцыруецца вучэбны працэс, укараняюцца найбольш актуальныя курсы па прыродазнаўчых і грамадскіх дысцыплінах, расце колькасць абмяркоўваемых тэкстаў і адкрытых заняткаў.

Партыйныя арганізацыі факультэтаў і падраздзяленняў сталі больш канкрэтна наладжваць сваю работу, ажыццяўляючы ў адпаведнасці з патрабаваннямі XXVI з'езда КПСС курс на дакладны аналіз усіх асноўных звенняў работы калектываў і іх грамадскіх арганізацый, на наладжванне здаровага і творчага мікраклімату.

Пярвічныя партыйныя арганізацыі, партком, рэктарат у 1982 годзе правялі значную работу па паляпшэнню вучэбнай і выхаваўчай работы з замежнымі грамадзянамі, якія вучацца ва універсітэце.

Разам з тым сход партыйнага актыву універсітэта адзначыў, што ў дзейнасці калектыву універсітэта, яго падраздзяленнях ёсць пэўныя пралікі. Патрабуе паляпшэння і далейшага ўдасканалення стан вучэбна-выхаваўчага працэсу, якасць чытання лекцый, правядзення семінарскіх заняткаў. Марудна ўкараняюцца ў практыку актыўныя формы правядзення вучэбных заняткаў. Па-ранейшаму адносна вялікая колькасць непаспяваючых студэнтаў, а таксама студэнтаў, якія займаюцца на «здавальняюча».

Патрабуе паляпшэння падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі праз аспірантуру і дактарантуру.

У падраздзяленнях універсітэта назіраюцца выпадкі парушэння працоўнай дысцыпліны, факты амаральных паводзін. Ёсць сур'ёзныя недахопы ў рабоце гаспадарчых службаў.

Неабходна павысіць эфектыўнасць ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы ў калектывах кафедраў, іншых падраздзяленнях, студэнцкіх групах, інтэрнатах універсітэта.

Па абмеркаванаму пытанню прынята адпаведная пастанова.

На сходзе была ўручана Ганаровая грамата Вярхоўнага Савета БССР, якой узнагароджана шматтыражная газета «Беларускі універсітэт» за актыўны ўдзел у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, у камуністычным выхаванні студэнцкай моладзі. Яе ўручыў загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ Ю. П. Смірноў.

Міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкоў паведаміў аб назначэнні рэктарам Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна акадэміка АН БССР Л. І. Кісялеўскага, які выступіў перад прысутнымі.

● ТРЫБУНА ПАРТОРГА

# Экзамен на сталасць

КАМУНІСТ І ЯГО СПРАВА... Ужо само спалучэнне гэтых слоў прадугледжвае найвышэйшую актыўнасць у выкананні службовых абавязкаў і грамадскіх даручэнняў. Пачуццё партыйнай адказнасці закладваецца і вывяраецца ў час праходжання кандыдацкага стажу.

Кандыдацкі стаж — гэта ўсебаковая, патрабавальная праверка якасцей кожнага, хто звязвае свой лёс з партыяй, барацьбой за ідэалы камунізму. Актыўней далучаць кандыдатаў да паўсядзённай партыйнай і грамадскай работы, правяраць іх на практычных справах, на выкананні канкрэтных заданняў і даручэнняў, клапаціцца аб тым, каб кожны з іх глыбока вывучаў і ўсвядоміў марксісцка-ленінскія ідэі і палітыку партыі, добра засвоіў абавязкі і правы камуніста — такія патрабаванні партыі.

Да нядаўняга часу ў партыйнай арганізацыі хімічнага факультэта і НДІ ФХП на ўліку стаяла пяць кандыдатаў у члены КПСС: старшы навуковы супрацоўнік П. Гапонік, студэнты С. Канаш, У. Працэнка, С. Зайцаў і Г. Цюрына. Зараз састаў кандыдатаў папоўніўся слухачамі падрыхтоўчага аддзялення Н. Грынь, М. Чарствовай, Н. Кайдак.

Усе кандыдаты ў члены КПСС з'яўляюцца прыкладам у рабоце і вучобе, прымаюць актыўны ўдзел у грамадскай дзейнасці. С. Канаш з'яўляецца членам бюро ЦК ЛКСМБ і камітэта камсамола універсітэта. У. Працэнка — член камітэта камсамола факультэта, адказны за ваенна-патрыятычную работу. П. Гапонік — член прафсаюзнага камітэта, узначальвае камісію па ахове працы і тэхніцы бяспекі. С. Зайцаў з'яўляецца старастай і сакратаром камітэта камсамола бюро патока.

Кандыдаты ў члены КПСС рэгулярна робяць справаздачы на пасяджэннях партыйнага бюро аб вытворчай рабоце, удзеле ў жыцці калектыву, выкананні партыйных і грамадскіх даручэнняў. Усе кандыдаты ў члены партыі з'яўляюцца слухачамі школы маладога камуніста, заняткі ў якой дапамагаюць ім глыбока вывучаць Статут і Праграму КПСС, засвоіць марксісцка-ленінскую тэорыю, усвядоміць палітыку партыі.

Партыйнае бюро факультэта будзе і далей удасканальваць работу з кандыдатамі ў члены КПСС. Гэта — гарантыя паспяховага вырашэння вялікай і адказнай задачы —фарміравання актыўных байцоў партыі.

**В. СІДЭРКА,**
**сакратар партыйнага бюро хімічнага факультэта.**

КАНФЕРЭНЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ

# КАРЫСНАЯ РАЗМОВА

НА ФІЛАЛАГІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ прайшла канферэнцыя чытачоў на тэму «Кнігам па філалогіі — высокую якасць». На яе былі запрошаны работнікі Дзяржаўнага камітэта па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю, прадстаўнікі МінВНУ БССР, а таксама выкладчыкі і студэнты факультэта.

Адкрыў канферэнцыю дырэктар выдавецтва БДУ, кандыдат філалагічных навук У. К. Касько, які расказаў аб задачах, што стаяць перад калектывам па задавальненню патрэб выкладчыкаў і студэнтаў у навуковай, вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратуры.

Аб выніках работы рэдакцыі літаратуры па філалогіі расказала загадчыца рэдакцыі І. В. Смяян.

Таваразнаўца самага буйнага ў рэспубліцы Цэнтральнага кніжнага магазіна Л. М. Разанцава адзначыла важнасць збору папярэдніх заказаў на спецыяльную літаратуру, расказала аб шляхах прапаганды і распаўсюджання кнігі.

У абмеркаванні кніг, падрыхтаваных калектывам кафедры рускай мовы пад рэдакцыяй заслужанага дзеяча навукі БССР П. П. Шубы, актыўны ўдзел прынялі студэнты 1 і 2 курсаў рускага аддзялення, а таксама выкладчыкі І. А. Карабан, І. К. Германовіч, якія працуюць над гэтым вучэбным дапаможнікам.

Дзелавая і патрэбная размова адбылася на канферэнцыі паміж стваральнікамі кнігі, тымі, хто яе распаўсюджвае, і чытачамі. Студэнты і выкладчыкі філалагічнага факультэта выказалі свае думкі наконт паляпшэння якасці выпускаемай прадукцыі.

**А. ЗЯНЬКЕВІЧ,**
**супрацоўніца выдавецтва БДУ.**



*Год мінулы — знамянальны для калектыву спецыяльнага канструктарскага бюро з доследнай вытворчасцю БДУ імя У. І. Леніна. Ён стаў пераможцам у сацыялістычным спаборніцтве сярод родных арганізацый. У новым годзе супрацоўнікі СКТБ абавязаліся прыкласці ўсе намаганні, каб пацвердзіць высокае званнне.*

*НА ЗДЫМКУ: інжынеры спецыяльнага канструктарскага бюро Аляксандр АДАМОВІЧ і Мікалай ПІСАРЫК за наладкай спектрометра.*

*Фота В. ШАЧАКА.*

ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

# Кліча «Мара»

**Бялюткай прасцінай пакрыў зямлю люты, мудрагелістымі ўзорамі размаляваў шыбы, трывала зашкліў вокны азёр і рэк.**

**Зіма надзейна ўсталявалася ў прыродзе. Але часам убачыш, як зіхаціць на аснежанай галінцы вясёлкавымі пералівамі прамень сонца, і прыпомніш лета: сонечнае, вясёлае, будатрадаўскае.**

У калідоры філфака на ўсю сцяну плакат — «Кліча СБА «Мара-83»! «Калі ты з ахвотай бярэшся за любую справу, любіш бадзёрую песню, хочаш набыць добрых сяброў — спяшайся стаць яго байцом. І не адкладвай на потым — спознішся!» Жадаючых — хоць адбаўляй.

Тыя, хто быў ужо членам «Мары», расказваюць пра два будатрадаўскія месяцы, як найлепшыя ў мінулым годзе.

Доўга яшчэ будуць прыпамінаць жыхары малдаўскага сяла Уладзіміраўка цікавыя канцэрты беларускіх студэнтаў, насычаныя выступленні агітбрыгады, шматлікія святы. Але самыя шчырыя падзякі — за добрую працу.

— Час, праведзены ў «Мары», незабыўны. Іменна ён найбольш запомніўся мне ў мінулым годзе,— гаворыць камандзір атрада, дэпутат Мінскага гарсавета, чацвёртакурсніца Таццяна Буркун.—У Малдавіі мы і папрацавалі няблага, і адпачылі выдатна.

— Па выніках працоўнага семестра атрад заняў другое месца на факультэце,— дадае Ірына Белік. — А галоўнае, мы пераканаліся, што многае можам зрабіць.

Дзяўчаты па-сапраўднаму пасябравалі з «Марай». І не дзіўна, што адрас працоўнага лета-83 шмат для каго з іх застанецца ранейшым: «Сяло Уладзіміраўка, Малдаўская ССР».

**В. ЖДАНКО.**

# Алгебру з гармоніяй злучыць

*Здавалася б, даўно канула ў Лету крыху наіўная, але па-юнацку шчырая дыскусія паміж «фізікамі» і «лірыкамі». Учарашнія барацьбіты за ўсеагульную тэхнізацыю сёння захапляюцца кнігамі Караткевіча, не на жарт крыўдзяцца, калі ім зноў не пашанцуе атрымаць білет на чарговую прэм'еру, з усіх сіл спрачаюцца з калегамі аб новым зборніку Вазнясенскага. А былыя лірыкі... Тыя з цікавасцю першаадкрывальнікаў гатовы ўвесь вечар прасядзець перад тэлевізарам, таму што прафесар Капіца зноў расказвае пра нешта відавочнае і неверагоднае; чакаць чарговай перадачы з цыкла «Жыццё навукі», а ў сяброўскіх размовах ужываць такія тэхнічныя тэрміны, што, паслухаўшы гэтую гутарку гадоў дваццаць назад, іх без ваганняў аднеслі б у стан «бяздушных фізікаў». Усё цячэ, усё змяняецца. Але... Зноў раздаюцца галасы пра тэхнізацыю і гуманітарызацыю, зноў адраджаюцца паўзабытыя «фізікі» і «лірыкі». Зноў, і па-новаму. Час пратэстуе супраць абыякавай паралельнасці суіснавання. Фарміраванне гарманічнай асобы ўключае ў сябе не толькі пэўны багаж прафесійных ведаў. Культурным лічыцца сёння той, хто пры ўмове свабоднай арыентацыі ў сваёй спецыяльнасці, мае ў той жа час і шырокае кола непрафесійных інтарэсаў. Такая рознабаковасць заўсёды станоўча адбіваецца на працоўных дасягненнях асобы. Нельга замыкацца толькі ў «тэхнічных» ці «лірычных» рамках. Жыццё патрабуе ўзаемасувязі, і універсітэцкая праграма навучання павінна гэта ўлічваць.*

*Ці дае дыплом аб заканчэнні ВНУ права лічыцца чалавекам высокай культуры? Ці пераходзіць аўтаматычна колькасць прачытаных кніг у якасць? Ці не збядняе сябе ўпэўнены ў патрэбнасці сваёй «вузкасці» вузкі спецыяліст? Пытанні, пытанні, пытанні... Яны датычацца і «фізікаў», і «лірыкаў», у роўнай ступені залежаць і ад тэхнікаў, і ад гуманітарыяў. Таму рэдакцыя лічыць, што артыкул дэкана механіка-матэматычнага факультэта М. Гарашчука, які ўзнімае пералічаныя вышэй праблемы, зможа паслужыць пачаткам актуальнай дыскусіі «Культурны чалавек. Які ён?»*

КОЖНАЯ эпоха па-рознаму вырашала праблему сувязі навукі і мастацтва, навукі і культуры. У наш век навукова-тэхнічнага прагрэсу ўзнікае шмат новых пытанняў ва ўзаемаадносінах дакладных навук з мастацкай культурай. Раней невядомы прэстыж навукі спрыяў росту перакананняў у тым, што асноўная сіла чалавечага розуму, інтэлекту, духоўнай энергіі павінна выкарыстоўвацца ў першую чаргу ў навуцы. Разам з тым сёння відавочна, што ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, навукі і культуры неабходна ўлічваць не толькі ўзрастаючую колькасць фактараў, якія датычаць розных галін ведаў, але ідэйныя, маральна-этычныя якасці людзей, агульны ўзровень іх культуры. Усё гэта важна для сённяшняга пакалення, але асабліва патрэбна моладзі — будучыні краіны.

Гарманічнаму развіццю асобы садзейнічаюць розныя фактары. Асобая роля ў гэтай справе належыць сістэме народнай адукацыі, і ў прыватнасці вышэйшай школе. Студэнцкая пара — выключна плённы час для ўсебаковага развіцця асобы. Адукацыя ў ВНУ — крыніца не адных толькі спецыяльных ведаў, але і вышэйшай духоўнай культуры, шырыні і глыбіні светапогляду, ведання працэсаў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Натуральна, што вывучэнне кожнага прадмета дае не толькі прафесійныя веды, але і стварае пэўны настрой, здаровы эмацыянальны стан. І хаця эпітэты «цудоўнае» ці «прыгожае» ўжываюцца ў мастацтве, галіна цудоўнага распасціраецца далёка за межы адзінага мастацтва. Прыгажосць прыроды, яе заканамернасці і законы адлюстроўваюцца таксама і ў чароўнасці адкрыццяў прыродазнаўчых навук, і ў прыватнасці ў матэматыцы, якая, па выказванню вядомых вучоных, ёсць правобраз прыгажосці свету. Успомнім школу Піфагора. У гэтай школе, як сцвярджаюць гісторыкі, нарадзілася ідэя аб тым, што матэматыка, матэматычная ўпарадкаванасць, уяўляе сабой фундаментальны прынцып, пры дапамозе якога можа быць абгрунтавана ўсё мноства з'яў. У гэтай школе Піфагор зрабіў сваё вядомае адкрыццё: вібрыруючыя струны, нацягнутыя аднолькава моцна, гучаць у тон адна адной, калі іх даўжыні знаходзяцца ў простых лікавых суадносінах. Гэтыя лікавыя суадносіны як першапрычына гармоніі з'явіліся адным з ашаламляльных адкрыццяў у гісторыі чалавецтва. Такім чынам, матэматычныя суданосіны з'явіліся і крыніцай прыгажосці. Усім з'явам і прадметам матэрыяльнага свету ўласцівы колькасныя характарыстыкі. А гэта прадмет матэматыкі! Разам з тым прадстаўнікам прыродазнаўчых і дакладных навук неабходна пэўнае знаёмства з літаратурай, мастацтвам, архітэктурай і інш.

Дакладная ацэнка цудоўнага ў мастацтве рыхтуе чалавека да праўдзівай ацэнкі лепшых якасцей у людскіх характарах, узмацняе ў іх пачуццё абавязку, адказнасці. Паводзіны чалавека залежаць ад узроўню яго маральнай культуры, ад ступені развіцця яго інтэлекту і эмоцый. Праз літаратуру мы далучаемся да асаблівых, яркіх, па-мастацку акрэсленых назіранняў, вобразаў, думак, пачуццяў. Адчуць «тёплый» снег ці ўявіць, як дождж «шлепал по воде легкой птичьей походкой» — праяўленне вышэйшага парадку.

Толькі прафесійнае захапленне і інтарэс непазбежна звужаюць магчымасці для камбінацый і развіцця здольнасцей чалавека. Змена захапленняў спрыяе пэўнай псіхалагічнай разрадцы, стварэнню добрага настрою. Вядома, што Эйнштэйн быў скрыпачом. І, як справядліва лічаць, ад гэтага выйграў не толькі Эйнштэйн, але і навука. «Матэматык, які не ёсць часткова паэт, ніколі не будзе сапраўдным матэматыкам».

РАЗАМ з тым, у эпоху навукова - тэхнічнага прагрэсу, у век матэматызацыі навук, які патрабуе рознабаковага гарманічна-

# Каб домам стаў інтэрнат

ГАЛОЎНАЯ задача вышэйшай школы на сучасным этапе — далейшае павышэнне навукова-практычнага ўзроўню падрыхтоўкі і ідэйна-палітычнага выхавання спецыялістаў. Толькі непарыўная сувязь вучобы і выхавання прывядзе да лепшага канчатковага выніку — высокага ўзроўню ведаў студэнтаў, іх сапраўднай камуністычнай ідэйнасці і пераканanасці, усебаковай падрыхтаванасці да паспяховай работы па спецыяльнасці і актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці. Сённяшнія студэнты — будучыя спецыялісты, вучоныя, кіраўнікі прадпрыемстваў, выхавацелі. Таму ўжо ў пару студэнцтва неабходна ўдасканальваць формы і метады маральнага і эстэтычнага выхавання моладзі, максімальна наблізіць усе мерапрыемствы па выхаванню да месца жыхарства студэнтаў.

Разнастайныя выхаваўчыя мерапрыемствы ў інтэрнаце № 2 праводзіць фізічны факультэт. Кіруе гэтай работай па даручэнню партыйнага бюро і дэканата дацэнт В. Ф. Стэльмах. На кафедрах зацверджаны канкрэтныя мерапрыемствы па камуністычнаму выхаванню студэнцкай моладзі.

Кафедрай біяфізікі падрыхтавана, напрыклад, сустрэча са студэнтамі з Афганістана. На ёй арганізатары выкарыстаюць багаты дапаможны матэрыял — каляровыя фотаздымкі, плакаты, паштоўкі.

Нярэдкай з'явай сталі ў інтэрнаце гутаркі і дыспуты на тэмы: беражлівыя адносіны да дзяржаўнай маёмасці — абавязак кожнага; вучоба і праца побач ідуць; як змястоўна праводзіць вольны час. Студэнты выказалі пажаданні паслухаць у інтэрнаце лекцыі: «Аб міжнародным становішчы», «Аб дружбе і каханні», «Пра сям'ю і шлюб», «Мода і ты». Без сумнення, прапановы слушныя, і мы спадзяёмся, што яны будуць ажыццёўлены.

Нашай кафедрай арганізавана спаборніцтва паміж жыхарамі інтэрната пад дэвізам «Здаровы быт — паспяховая вучоба». Распрацаваны ўмовы спаборніцтва і крытэрыі падвядзення вынікаў, якія ўключаюць усе бакі жыцця студэнтаў: вучобу, актыўнасць у грамадска-палітычным жыцці факультэта і інтэрната, выкананне рэжыму працы і адпачынку, правілаў унутранага распарадку, беражлівыя адносіны да грамадскай маёмасці і іншыя.

Чарговая праверка паказала паляпшэнне санітарнага стану пакояў, імкненне студэнтаў да паляпшэння ўмоў быту і адпачынку, эканоміі вады і электраэнергіі. На жаль, адміністрацыя інтэрната № 2, якая абавязана дапамагаць сваім жыхарам, не заўсёды выконвае просьбы і заўвагі правяраючых, не ўлічвае прапаноў выкладчыкаў, якія працуюць са студэнтамі ў інтэрнаце.

Прывяду прыклад. Студэнткі пакоя № 1207а запісалі просьбу зашкліць фортку ў лістападзе 1982 года. Сталяр прыйшоў, забраў яе, а прынёс толькі праз тры месяцы. Аўтар гэтых радкоў тры разы запісвала ў журнал правяраючых просьбу паставіць фортку на месца, але дарэмна. 21 студзеня такі ж запіс у журнал зрабілі куратары Н. А. Пракошына і Н. М. Хаўратовіч. Нарэшце звярнулася да каменданта. На маё пытанне ў адказ пачула: «Я занята. А студэнты хай запісваюць у журнал». Каментарыі, як кажуць, лішнія.

Як відаць з гэтага прыкладу, адміністрацыя інтэрната не выконвае сваіх прамых абавязкаў. І, вядома, з-за гэтага эфектыўнасць усёй выхаваўчай работы ў інтэрнаце зніжаецца.

І апошняе. Спадзяёмся, што дэканат фізфака вырашыць пытанне аб узнагароджанні пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва «Здаровы быт — паспяховая вучоба».

**В. САЦУКЕВІЧ,**
**асістэнт кафедры біяфізікі,**
**адказная за работу**
**ў інтэрнаце.**







*Лабараторыя размнажальнай тэхнікі існуе ў БДУ імя У. І. Леніна з 1961 года. Яна забяспечвае ўсе падраздзяленні універсітэта вучэбнымі праграмамі і метадычнай літаратурай, разнастайнымі бланкамі — усяго 2 мільёны лістоў у год.*

*Сёння лабараторыя аснашчана двума ратапрынтамі, брашуравальнай машынай, ёсць тут і ўчастак падрыхтоўкі асноў — электрафотаздымкаў на метале, з якіх друкуецца ўся прадукцыя.*

*НА ЗДЫМКАХ: друкар В. А. САСНОЎСКІ і электрафатограф Т. М. ЦЕРАХ—МАЦЮШЭЎСКАЯ перад пачаткам работы; друкар Л. М. АСТРОЎСКІ асвоіў сумежную спецыяльнасць электрафатографа; загадчык лабараторыі Г. М. ПАЛЯНСКІ і інжынер М. М. ЗІМОЎСКІ.*

# Сустрэчы, конкурсы, канцэрты

**КАНІКУЛЫ. Гэта, напэўна, самая доўгачаканая і цудоўная пара для студэнтаў. Здадзены залікі і экзамены. Можна нейкі час не хвалявацца і пажыць, як любяць казаць студэнты, для сябе. У гэтым «для сябе» — паходы ў кіно, тэатр, паездкі за горад, нарэшце, можна заняцца любімай справай і пачытаць цікавую кнігу, а то і проста пагуляць на свежым паветры.**

**Але ўдзельнікі калектываў мастацкай самадзейнасці БДУ імя У. І. Леніна з нецярпеннем чакаюць канікулаў яшчэ і таму, што ў гэты час праводзяцца адказныя конкурсы, канцэрты, цікавыя сустрэчы.**

**Наш карэспандэнт задала некалькі пытанняў дырэктару студэнцкага клуба Уладзіміру Міхайлавічу МАКАРЭВІЧУ.**

**— Уладзімір Міхайлавіч, скажыце, калі ласка, дзе пабывалі ў час канікулаў калектывы мастацкай самадзейнасці універсітэта?**

— Напэўна, самай галоўнай падзеяй з'яўляецца тое, што народная харавая капэла БДУ (мастацкі кіраўнік — выпускнік Ленінградскай кансерваторыі Ігар Гаўрылавіч Мацюхоў) стала прызёрам VI Міжрэспубліканскага конкурсу змешаных хораў вышэйшых навучальных устаноў «Ювентус-83», які праходзіў у Каўнасе. Шосты раз тут сабралася вялікая і дружная сям'я студэнтаў-энтузіястаў харавых спеваў. Конкурсы «Ювентус» сталі традыцыйнымі святамі інтэрнацыянальнай дружбы студэнцкай моладзі розных рэспублік краіны, прызнанымі спадарожнікамі студэнцкіх свят «Гаўдэамус». Дэвіз конкурсу: «Песняй праславім дружбу».

Харавая капэла універсітэта — адзіны прадстаўнік калектываў харавога мастацтва Беларусі. У конкурсе «Ювентус» яна ўдзельнічала ўжо пяты раз. І пасля кожнага канцэрта — незабыўныя і непаўторныя ўспаміны.

**— Прабачце, Уладзімір Міхайлавіч. Напэўна, многія нашы чытачы не ведаюць, як праводзіцца конкурс «Ювентус», хто мае права ўдзельнічаць у ім?**

— Конкурс «Ювентус-83» праводзіў Каўнаскі політэхнічны інстытут імя Антанаса Снечкуса. У ім удзельнічаюць змешаныя харавыя калектывы ВНУ, за выключэннем вышэйшых музычных навучальных устаноў. Забараняецца таксама ўдзел у конкурсе харыстам і салістам-прафесіяналам.

Конкурс праводзіўся ў два туры. На першым выконваецца 30-мінутная праграма, у якой сярод іншых абавязкова павінны гучаць навейшыя творы на патрыятычную, а таксама маладзёжную тэматыку, выбраны твор паліфанічнага стылю і песня К. Брундзайтэ «Цень».

На другі тур журы прапануе не больш за шэсць калектываў. Праграма яго не рэгламентуецца.

Наша харавая капэла ўзнагароджана дыпломам ЦК ЛКСМ Літвы і прызам за выкананне лепшых твораў на патрыятычную тэматыку.

**— Конкурс «Ювентус-83», зразумела, не адзіны, дзе ўдзельнічала народная харавая капэла універсітэта?**

— Так. Майстэрства харавой капэлы адзначана дыпломамі, граматамі, прызамі, заваяванымі калектывам на прадстаўнічых конкурсах, фестывалях, аглядах. Напрыклад, у 1967 годзе народная харавая капэла адзначана дыпломам III ступені Усесаюзнага агляду мастацкай самадзейнасці, у 1982 годзе калектыў узнагароджаны дыпломам пераможцы Усесаюзнага конкурсу на лепшае выкананне савецкай патрыятычнай песні.

Хочацца адзначыць актыўных удзельнікаў капэлы. Гэта Вячаслаў Іванавіч Жылінскі. У капэле спявае ўжо дзесяць гадоў, чацвёрты раз удзельнічае ў конкурсе «Ювентус». Студэнткі філалагічнага факультэта Вольга Сталбова і Лілія Шаўцова, Уладзімір Сідаровіч, Уладзімір Федарэнка (факультэт радыёфізікі і электронікі), Людміла Рагозіна (біялагічны факультэт).

**— Ва універсітэт з візітам дружбы прыязджаў самадзейны народны ансамбль песні і танца «Шовкова косиця» Ужгарадскага дзяржаўнага універсітэта...**

— Бясспрэчна, такія візіты па абмену вопытам не праходзяць дарма. Кожны чэрпае з работы калег лепшае, каштоўнае, выкарыстоўвае яго па меры магчымасці ў сябе.

Ансамбль «Шовкова косиця» выступіў з канцэртам перад студэнтамі горада Мінска ў міжнародным маладзёжным цэнтры «Юнацтва». Танцавальная група ансамбля пабывала на рэпетыцыі народнага ансамбля танца «Крыжачок».

**...Надоўга застануцца ў памяці ўдзельнікаў калектываў мастацкай самадзейнасці універсітэта паездкі, сустрэчы, конкурсы, канцэрты, дзе яны знайшлі сапраўдных сяброў.**

**Запісала З. АЛЯШКЕВІЧ,**
**наш кар.**

га развіцця асобы, кожны выпускнік гуманітарнай ВНУ ці факультэта павінен атрымаць некаторае азнаямленне з дасягненнямі прыродазнаўчых навук. Пэўны аб'ём падобных ведаў павінен уваходзіць у інтэлектуальны багаж кожнага адукаванага чалавека, аказваць уплыў на фарміраванне навуковага светапогляду.

Паўтара стагоддзя назад паявіліся пушкінскія словы «Поверил я алгеброй гармонию». Многія напрамкі даследаванняў мастацкай культуры з дапамогай дакладных метадаў былі пачаты параўнальна даўно. Ужо ў XVIII стагоддзі людзі спрабавалі складаць музыку «немузычнымі» сродкамі. У той час была вельмі распаўсюджана музычная ігра з ігральнымі касцямі, якой захапляліся такія кампазітары, як Гайдн і Гендэль.

Так, задоўга да ЭВМ, матэматычныя прыёмы выкарыстоўваліся ў музыцы. Сёння вывучэнне мастацтва з выкарыстаннем матэматычных сродкаў удасканальваецца, але мы не збіраемся абсалютызаваць метады матэматыкі. Ёсць і будуць абмежаванні ў выкарыстанні дакладных метадаў у галіне мастацкай творчасці. Працэс пазнання з'яў жыцця і прыроды рознымі сродкамі і метадамі працягваецца. Не лічыцца з гэтым нельга.

ЦІКАВА, што многія адкрыцці ў навуцы, напрыклад, стварэнне ЭВМ — вынік не толькі прафесійных ведаў чалавека, але і духоўных. Гэта дзіўнае тварэнне чалавечага розуму можа выклікаць такое ж пачуццё гордасці і натхнення, як і лепшыя творы мастацтва. Шырыня сучасных навуковых напрамкаў, змест работы кожнага чалавека выклікаюць неабходнасць новых кантактаў паміж людзьмі самых розных спецыяльнасцей. Надышоў час больш сур'ёзна падумаць і знайсці дзейсныя формы ўзаемапранікнення навук, вывучэння магчымасцей карэкціроўкі навучання маладых спецыялістаў, як «тэхнікаў», так і «лірыкаў». Для ВНУ задача заключаецца ў тым, каб узбагаціць планы падрыхтоўкі спецыялістаў на прыродазнаўчых і тэхнічных факультэтах прадметамі гуманітарнага цыкла, а на гуманітарных — матэматычнымі метадамі пазнання, вывучэннем некаторых аспектаў дасягненняў навукі і тэхнікі. Асабліва спрыяльныя ўмовы для вырашэння такой задачы ва універсітэце, дзе вывучаецца дастаткова шырокі спектр навук.

Універсітэцкая сістэма адукацыі павінна спрыяць узбагачэнню ўсіх відаў навучання. Гэта можа ажыццявіцца праз уключэнне асобных праблемных пытанняў у вучэбны план, дапаможа тут і сістэма спецкурсаў, факультатываў. Праблеме ўзаемаўзбагачэння адукацыі павінна ўдзяляцца вялікая ўвага ў ходзе арганізацыі самых разнастайных мерапрыемстваў, такіх, як лекцыі «фізікаў» для «лірыкаў» і наадварот, дыспуты, сустрэчы з вучонымі, дыскусіі, вечары пытанняў і адказаў...

Трэба адзначыць пэўныя станоўчыя крокі ў гэтым напрамку на механіка - матэматычным факультэце. Так, шэраг гадоў прафесар філалагічнага факультэта, вядомы паэт А. А. Лойка чытаў будучым матэматыкам факультатаўны курс «Тэндэнцыі развіцця беларускай літаратуры». У многіх матэматычных курсах закранаюцца метадалагічныя праблемы навукі, прыводзяцца веды з канкрэтнай эканомікі, сацыялогіі. Некаторыя выкладчыкі ўключаюць у планы лекцый элементы гуманітарных ведаў, гістарычныя даведкі, эстэтычнае ці філасофскае тлумачэнне рэзультатаў. Работа ў гэтым напрамку павінна быць сістэматычнай, у яе трэба ўключыць камітэты камсамола факультэтаў, якія дапамаглі б у наладжванні міжфакультэцкіх сувязей, важных для ўзаемаўзбагачэння. Пытанне больш цесных кантактаў паміж калектывамі мае для універсітэта вялікае значэнне, хаця б таму толькі, што кожны чалавек адчувае «неабходнасць у тым найвялікшым багацці, якім з'яўляецца другі чалавек».

Злучыць алгебру з гармоніяй — задача такая ж захапляючая, як і складаная, яна патрабуе энтузіястаў!

**М. ГАРАШЧУК,**
**дэкан механіка-матэматычнага факультэта.**

# «...Буду вечна маладым»

ЯК НАЛАДЗІЦЬ камсамольскую работу, знайсці падыход да людзей, зацікавіць іх? Камсорг Людміла Рыжэвіч не магла знайсці адказ на гэтыя пытанні. Ды ці ў яе сілах, магчымасцях было абвергнуць знаёмую ісціну: адзін у полі не воін. А «ваяваць» даводзілася адной: без належнай дапамогі пасіўнага «актыву» камсамольскай арганізацыі ўпраўлення.

За год куратарства Міхаіла Емяльянавіча шмат цікавых спраў запісалі на свой рахунак камсамольцы. Новым было нават тое, што знялі з парадку дня праблему наведвання сходаў, перыядычнасці іх правядзення, што акуратна стала весціся дакументацыя. А розныя мерапрыемствы? Напрыклад, сустрэча з будаўнікамі метро.

Вось у такіх умовах пачынаў сваю шэфскую работу М. Я. Бондар. Міхаіл Емяльянавіч — камсамолец 30-х, камуніст з саракагадовым стажам, ветэран Вялікай Айчыннай вайны. Іменна гэтага чалавека, душэўнага, чулага, які разумее моладзь, пранікаецца цікавасцю да спраў сённяшніх камсамольцаў, члены партбюро ўпраўлення выбралі куратарам камсамольскай арганізацыі.

Міхаіл Емяльянавіч адразу ж узяўся за справу. Разам з Людай Рыжэвіч пачаў падбіраць актыў, які б дзейнічаў, прапанаваў камсамольцам новыя цікавыя мерапрыемствы і дапамагаў іх ажыццявіць. Значна актывізавалася камсамольскае бюро. Калі раней на яго рэдкіх пасяджэннях часта разглядаліся другарадныя пытанні, то зараз актыў часцей збіраўся для вырашэння вытворчых задач. Здаючы Ленінскі залік, кожны член ВЛКСМ расказваў пра свае поспехі на рабочым месцы і пра ўдзел у жыцці камсамольскай арганізацыі.

І хаця ў душы радуецца Міхаіл Емяльянавіч пачынанням сваіх падшэфных, але ж чакае ад іх значна больш. Так і сказаў ён на адным з апошніх партыйных сходаў пасля таго, як Люда Рыжэвіч паведаміла камуністам пра работу Бондара, пра яго ўклад у актывізацыю работы камсамольцаў.

— Нераўнадушны чалавек, — ахарактарызавала Бондара сакратар партбюро ўпраўлення Ірына Уладзіміраўна Арэхоўская. — Акрамя сваёй непасрэднай работы ў аддзеле аховы працы, Міхаіл Емяльянавіч шмат дапамагае моладзі. І гэта нельга назваць даручэннем, гэта справа душы вечна маладога чалавека. Вогненная маладосць назаўсёды пакінула ў ім агеньчык камсамольскага запалу.

Такі ён, камуніст Міхаіл Емяльянавіч Бондар — надзейны таварыш камсамольцаў, не толькі настаўнік, але і самы актыўны ўдзельнік усіх пачынанняў моладзі.

**А. ГРЫШКЕВІЧ.**

# Заставацца неабходнай

МАЛАДОСЦЬ. Як гэта ні дзіўна, але і яна — паняцце адноснае. Пра Лідзію Канстанцінаўну Пясткоўскую смела можна сказаць, што ў свае пяцьдзесят яна застаецца маладой, захопленай, улюбёнай у працу, цікавіцца ўсім новым. Старшы бібліятэкар абанемента навуковай і мастацкай літаратуры бібліятэкі БДУ імя У. І. Леніна, яна ўжо дваццаць восьмы год працуе тут. Але не толькі працягласцю часу вызначаюцца працоўныя дасягненні Лідзіі Канстанцінаўны. Узячнасць і павага чытачоў — вось што цэніць яна вышэй за ўсё, іменна гэта лічыць сапраўдным паказчыкам поспеху.

Абслугоўванне чытачоў, замена літаратуры, папаўненне бібліятэчнага фонду, тэматычныя выстаўкі — усё гэта звычайныя абавязкі бібліятэкара, але дзейнасць і інтарэсы Лідзіі Канстанцінаўны не абмяжоўваюцца толькі імі. Л. К. Пясткоўская — жаданы госць студэнтаў многіх факультэтаў, арганізатар і ўдзельнік шматлікіх вечароў, дыспутаў на літаратурныя тэмы. Яна не навязвае моладзі тэмы дыскусій, іх знаходзяць самі студэнты, бібліятэкар толькі падказвае, дапамагае, і ў выніку — цікавая для ўсіх сустрэча.

Для Лідзіі Канстанцінаўны і студэнтаў механіка-матэматычнага факультэта памятны дыспут аб фантастычнай літаратуры. Асабліва цікавым было тое, што кнігі па фантастыцы абмяркоўваліся не толькі з пункту гледжання іх мастацкай якасці. Студэнты, выкарыстоўваючы набытыя на факультэце веды, размаўлялі аб навуковых праблемах, закранутых у фантастычнай літаратуры.

Семінар па навуковаму атэізму сярод супрацоўнікаў бібліятэкі, лекцыі па грамадзянскай абароне, палітінфармацыі, работа на падрыхтоўчым аддзяленні для замежных грамадзян — вось кола грамадскіх абавязкаў старшага бібліятэкара. І як на ўсё энергіі хапае? Але ж хапае, таму што праца цікавая, патрэбная. А захопленасць і нястомнасць яна, як эстафету, перадае сваім маладым супрацоўніцам. «Нам сорамна было б адставаць ад Лідзіі Канстанцінаўны, таму стараемся», — гавораць Галя Шаціла, Люда Тамашэўская, Фаіна Мірошчанка.

...Дома ў Лідзіі Канстанцінаўны — шматлікія граматы, пісьмы з падзякамі, са словамі ўдзячнасці да добрага працаўніка і шчырага чалавека. Яны — сведкі яе жыцця, запоўненага натхнёнай працай, радасцю ад сустрэч з людзьмі, жаданнем заўсёды быць і заставацца патрэбнай акружаючым.

**В. КАЗЫРА.**

# Патрабавальная дабрата

## НЕКАЛЬКІ ЭПІЗОДАЎ З ЖЫЦЦЯ КУРАТАРА

КУРАТАР... Якім мы ўяўляем яго? У школе сказалі б проста — класны кіраўнік. Але тут, у ВНУ, яго падапечныя не дзеці, а зусім дарослыя людзі. Гэта ставіць перад педагогам няпростыя задачы, лічыць Ларыса Уладзіміраўна Вянжыцкая, выкладчыца кафедры нямецкай мовы Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, якая ўжо некалькі гадоў працуе куратарам на педагагічным патоку хімічнага факультэта.

Першы курс — ён і ёсць першы: студэнты нясмелыя, лёгка бянтэжацца і ад гэтага ўсе вельмі падобныя адзін на аднаго. На лекцыях пакуль яшчэ вельмі ўважлівыя, запісваюць амаль кожнае слова выкладчыка. У канцы лекцыі — ніводнага пытання, хоць няведання ў вачах не паменшылася, магчыма, нават павялічылася. Ім незнаёма яшчэ пачуццё локця, не умеюць (ці саромеюцца) размаўляць... Як разбудзіць іх? Як навучыць думаць? Як прымусіць адчуць, што яны — група, што на 5 гадоў яны разам, што на ўсё жыццё — калегі, а можа, і сябры? Пра гэта думае яна, куратар.

— РАБЯТЫ, у мяне ёсць надзвычай цікавая прапанова, — урачыста абвясціла аднойчы Ларыса Уладзіміраўна, заходзячы ў аўдыторыю. — Чаму б нам не заняцца разам важнай і патрэбнай справай? Я прапаную наступнае: набліжаецца дзень нараджэння Леніна, давайце да гэтай даты збяром матэрыял аб знаходжанні Уладзіміра Ільіча за мяжой, у эміграцыі.

Прапанова была прынята аднадушна.

Усёй групай склалі і разаслалі пісьмы ў музеі тых краін, дзе бываў Ленін. Да гэтага нямала пакарпелі ў бібліятэцы, шукаючы адрасы музеяў. Пакуль чакалі адказаў, не трацілі марна час — збіралі матэрыял у музеях і бібліятэках рэспублікі. Вынікі пераўзышлі спадзяванні: амаль усе музеі прыслалі кнігі аб знаходжанні Леніна ў данай краіне, фотаздымкі, копіі дакументаў, напісаных рукой Уладзіміра Ільіча, маркі, значкі, прысвечаныя вялікаму правадыру.

Студэнты прапанавалі арганізаваць выстаўку сабраных матэрыялаў. Малявалі, клеілі, рыхтавалі стэнды, затрымліваючыся пасля заняткаў не на гадзіну і не на дзве. Яна не прасіла іх, яна старалася толькі своечасова даць патрэбную параду, падтрымаць, сачыла, як нараджаліся група, калектыў.

Выстаўка, дакладней, музей у мініяцюры «Ленін у эміграцыі» атрымаў высокую ацэнку наведвальнікаў — студэнтаў, выкладчыкаў, школьнікаў. Матэрыялы музея спатрэбіліся ў час педпрактыкі ў школах. Але сутнасць не толькі ў гэтым.

— Галоўнае, я заўважыла, — гаварыла Ларыса Уладзіміраўна, — што у час гэтай работы і пасля яе студэнты ахвотней сталі бываць разам. Цяпер ужо не я, а яны былі ініцыятарамі паходаў у кіно, тэатр або сустрэч з ветэранамі вайны, з вядомымі хімікамі, з пісьменнікамі.

ПРАЙШЛО нямнога часу, і я зразумела яшчэ адну няхітрую ісціну: групы, як і людзі, бываюць самыя розныя, не падобныя адзін на аднаго. Прычым кожны чалавек з уласцівымі яму своеасаблівымі рысамі, як гук у мінорным ці мажорным акордзе, уносіць у стыль жыцця групы свой штрых. І я пачала ўважлівей углядацца ў твары рабят, вывучаць характары. І выявіла, што, здаючыся мне зразумелымі і знаёмымі, яны аказаліся вельмі складанымі...

Практыка ў Сашы павінна была праходзіць у адной са школ Мінска. З хваляваннем чакаў юнак дня, калі, узброены ўказкай і класным журналам, ён пераступіць парог і скажа: «Добры дзень, рабяты! Сядайце. Пачнём урок...»

Нарэшце прыйшоў гэты першы дзень першай практыкі. Спачатку было ўсё так, як уяўляў Саша — цяпер Аляксандр Пятровіч. Вучні з цікавасцю прыглядаліся да новага настаўніка, не гаманілі, уважліва слухалі яго тлумачэнні. Пасля тлумачэння новай тэмы падняўся невысокі здаравяка з нейкімі нахабнымі вачыма: «Можна пытанне?» Саша ўзрадаваўся: калі ёсць пытанні, значыць, слухаюць уважліва, і не проста слухаюць — думаюць. Але пытанне, зададзенае вучнем, было зусім не па тэме: «Вы не падкажаце, дзе дастаць джынсы?» Чырвоны, як вараны рак, выскачыў Саша з класа.

«Не атрымаецца з мяне настаўнік», — з адчаем заявіў ён Ларысе Уладзіміраўне. Яна, дведаўшыся, у чым справа, супакоіла студэнта: нічога страшнага не здарылася. З-за аднаго нельга траціць веры ва ўсіх. Ты ж сам гаворыш, што клас няндрэнны, дружны, і я ўпэўнена, што вучні самі паразмаўляюць з нахабнікам. А ты павінен падумаць, як адказаць яму. Калі не адкажаш — гэта будзе мінус табе перад класам». Саша павесялеў: «Ваша праўда, Ларыса Уладзіміраўна, не такое ўсё страшнае, як здалося мне спачатку...»

На вуліцы ўжо сцямнела, а невысокая шэравокая жанчына нешта тлумачыла хлопцу, які ўважліва слухаў яе.

ТРЭЦІ дзень запар не было на занятках Тані. Дзяўчаты-аднакурсніцы сумеліся, перш чым адказаць на пытанне куратара, дзе яна. Потым растлумачылі: разбілася ў Тані каханне, а павінна паявіцца дзіця. Баючыся абгавораў, будучая маці вырашыла пакінуць вучобу.

Ларыса Уладзіміраўна даўно заўважыла невясёлыя вочы Тані, адчувала, што ў дзяўчыны нешта здарылася. Вось толькі што? Не знайшлося часу пацікавіцца раней. І цяпер яна дакарала сябе за гэта.

Вянжыцкая прыехала да Тані дадому. Размова была цяжкай. Нялёгка пераканаць маладую жанчыну ў тым, што ніхто не стане ганьбіць яе. Наадварот, мацярынствам патрэбна ганарыцца. Таня ж рыхтуецца стаць маці, даць жыццё новаму чалавеку. Урэшце Таня згадзілася забраць назад заяву з просьбай выключыць яе з універсітэта...

Потым, калі ўручалі дыпломы і Таню ў зале чакаў двухгадовы сын Сярожка з бабуляй, яна са слязамі на вачах абняла Ларысу Уладзіміраўну і сказала: «Дзякуй Вам. За ўсё».

— За гады сваёй работы куратарам я прыйшла да вываду: вельмі важна ўмець наладзіць са студэнтамі нефармальныя адносіны. Якія іменна? А вось такія — з радасцю або з няшчасцем, за парадай і за дапамогай студэнты ідуць перш за ўсё да мяне, свайго выхавацеля. Яны ведаюць, што для мяне неабыякавыя іх справы, іх інтарэсы. Я не адмахнуся ад іх, як бы ні была занята. І не толькі яны, але і я сама іду да іх, бо ў зносінах з імі таксама адчуваю настойлівую патрэбу.

**Т. ЕРМАЛАЕВА.**



*Зімовы эцюд.* *Фота В. ШАЧАКА.*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

17 лютага 1983 г.

Зак. 328 АТ 04093

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ